*The article analyzed the key competencies that are necessary for library and information specialists in the age of intensive development of information technologies. The article contains references to educational standards that guide the Faculty of Information and Document Communications of the Belarusian State University of Culture and Arts in the area of training of librarians-bibliographers. The author analyzes the foreign experience of identifying competencies that are in demand by practice.*

Статья поступила в редакцию 01.04.2019

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Яцэвіч Мікалай Аляксандравіч***
***Касап Вера Аляксандраўна***
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў

## РАЗВІЦЦЁ І СУЧАСНЫ СТАН НАВУКОВА-ПЕДАГАГІЧНАЙ ШКОЛЫ Ў ГАЛІНЕ БІБЛІЯТЭКАЗНАЎСТВА, БІБЛІЯГРАФАЗНАЎСТВА І КНІГАЗНАЎСТВА

Феномен навуковых школ вядомы ў навуцы з Сярэднявечча, калі карыфеі ад навукі збіралі вакол сябе здольных вучняў, дыскутавалі па актуальных праблемах і выпрацоўвалі падыходы да даследавання розных тэм. У наш час навуковыя школы прызнаюцца адной з важкіх форм узаемадзеяння паміж вучонымі. Сучасныя навуковыя школы маюць мэту аб'яднаць намаганні навукоўцаў для вырашэння актуальных для навукі праблем. Яны функцыянуюць пад кіраўніцтвам прызнанага ў сваёй галіне навуковага лідара, доктара навук і з'яўляюцца пляцоўкай для абмеркавання, прасоўвання і развіцця навуковых ідэй, падрыхтоўкі маладых таленавітых навуковых кадраў. Як адзначае Т.В. Захарчук, у бібліятэчна-інфармацыйных навуках на прасторы СНД навуковыя школы з'явіліся толькі ў 1980-я гг. у сувязі з накапленнем пэўнага навуковага вопыту і кадравага патэнцыялу [3].

У Беларусі першыя кандыдацкія дысертацыі па спецыяльнасці «Бібліятэказнаўства і бібліяграфазнаўства» былі абаронены выкладчыкамі спецыяльных дысцыплін бібліятэчнага факультэта толькі ў другой палове 1960-х гг. у Маскоўскім дзяржаўным інстытуце культуры. Першая абарона кандыдацкай дысертацыі па бібліятэказнаўстве адбылася ў 1967 г. – М.І. Пакалы на тэму «Кніжны фонд сельскіх бібліятэк Беларускай ССР». Пасля гэтага па мэтавым накіраванні навучаліся ў аспірантуры Маскоўскага і Ленінградскага інстытутаў культуры выкладчыкі факультэта, дзе і абаранялі дысертацыі. Навуковая школа ў галіне бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства Беларусі бярэ пачатак з 1990 г., калі на факультэце бібліятэказнаўства і бібліяграфіі Мінскага інстытута культуры была адкрыта аспірантура па спецыяльнасці 05.25.03 «Бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства», а ў 1994 г. школа была афіцыйна зацверджана Вышэйшай атэстацыйнай камісіяй (ВАК) Рэспублікі Беларусь. У 1996 г. пачала дзейнічаць магістратура па спецыяльнасці «бібліятэказнаўства і бібліяграфія», якая разглядалася як першая ступень для навучання ў аспірантуры.

На фарміраванне навуковай школы ў бібліятэказнаўстве, бібліяграфазнаўстве і кнігазнаўстве Беларусі аказваюць уплыў: прыналежнасць даследаванняў да сферы культуры; маладосць саміх навук, якія сфарміраваліся ў XIX ст., а першыя навуковыя публікацыі з'явіліся толькі пасля Вялікай Айчыннай вайны; тэрытарыяльная абмежаванасць даследаванняў пераважна г. Мінскам, адсутнасць навукова-даследчых інстытутаў у галіне бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства (часткова іх функцыю выконваюць Нацыянальная бібліятэка Беларусі (НББ) і Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў (БДУКМ); навукова-прыкладны характар даследаванняў, вынікі якіх скіраваны на вырашэнне актуальных тэарэтычных, арганізацыйна-тэхналагічных і метадычных праблем бібліятэк.

Навуковая школа ў галіне педагогікі «Бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства» аб'ядноўвае вучоных агульнымі прынцыпамі, тэарэтыка-метадалагічнымі асновамі вырашэння галіновых навуковых праблем, забяспечвае кожнаму яе ўдзельніку магчымасць далейшага развіцця і ўдасканалення.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асаблівасцю нацыянальнай навуковай школы з'яўляецца тое, што ў ёй адначасова працуюць прадстаўнікі двух-трох пакаленняў вучоных. Развіццё інфармацыйных тэхналогій у бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці, узмацненне педагагічнага аспекту ў выхаванні карыстальнікаў бібліятэк, фарміраванні інфармацыйнай і кніжнай культуры, іншыя фактары паспрыялі правядзенню даследаванняў міждысцыплінарнага характару.

Як адзначае Л.В. Астахава, даследчыцкая праграма навуковых школ у галіне бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства вельмі часта сфармулявана абагульнена, што звязана з асаблівасцямі гуманітарных ведаў [1]. У Беларусі сфарміраваліся некалькі буйных кірункаў даследаванняў у межах навуковай школы: даследаванне інфармацыйных рэсурсаў, кніжная культура, падрыхтоўка бібліятэчных кадраў, фарміраванне інфармацыйнай культуры карыстальнікаў і інш.

Важным фактарам беларускай навукова-педагагічнай школы ў галіне бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства з'яўляецца тое, што кожны з яе членаў прызнае прыналежнасць да школы і падтрымлівае сфарміраваныя традыцыі, закладзеныя яе лідарам.

Вынікі дзейнасці навуковай школы можна ацаніць, аналізуючы дакументны паток (выдавецкую прадукцыю), кожны элемент якога сведчыць аб пэўным укладзе яе членаў. Так, аналіз зместу зборнікаў навуковых прац дазваляе ўстанавіць ступень актыўнасці асобных яе прадстаўнікоў як у межах рэспублікі, так і ў замежных краінах, артыкулы ў перыядычных выданнях даюць магчымасць ацаніць уклад аўтараў у распрацоўку навуковых напрамкаў, рэцэнзіі даюць ацэнку навуковай прадукцыі, а аналіз аўтарэфератаў дысертацый сведчыць аб падрыхтоўцы кадраў для навуковай школы [5].

Гісторыю і дынаміку развіцця нацыянальнай навуковай школы па педагогіцы «Бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства» глыбока і ўсебакова даследавалі Я.Д. Грыгаровіч і В.Е. Лявончыкаў [2; 7], М.А. Яцэвіч і С.У. Ліпень (на прыкладзе аўтарэфератыўнай дысертацыі) [6; 8]. Так, адзначалася, што на першым этапе развіцця школы па выніках даследаванняў за 1986–2001 гг. было апублікавана 657 работ, сярод якіх пераважала

тэматыка бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства, гісторыя і сучасны стан бібліятэчнай справы і кнігазнаўства [7].

Заснавальнікам і навуковым кіраўніком школы доўгі час з'яўляўся доктар педагагічных навук, прафесар, член грамадскай арганізацыі (ГА) «Міжнародная акадэмія інфарматызацыі пры ААН» (Масква), член-карэспандэнт ГА «Беларуская акадэмія адукацыі» В.Е. Лявончыкаў.

Педагагічная дзейнасць В.Е. Лявончыкава пачалася ў кастрычніку 1962 г. у Мінскім дзяржаўным педагагічным інстытуце імя М. Горкага, а з адкрыццём у 1975 г. Мінскага інстытута культуры ён быў прызначаны на пасаду дэкана бібліятэчнага факультэта. Больш за 26 гадоў ён узначальваў наступныя тры кафедры: агульнай бібліяграфіі, бібліяграфіі і дакументазнаўства, тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый. У навукова-педагагічнай дзейнасці праявіўся яго талент буйнога вучонага і арганізатара падрыхтоўкі бібліятэчных кадраў. В.Е. Лявончыкаў першым у Беларусі абараніў не толькі кандыдацкую, але і доктарскую дысертацыю ў галіне бібліяграфазнаўства. Ступень кандыдата навук яму была прысуджана за абарону дысертацыі на тэму «Агульная рэтраспектыўная бібліяграфія кніг Беларусі: гісторыя і тэарэтычныя пытанні» (1969), падрыхтаваную падчас навучання ў аспірантуры Маскоўскага дзяржаўнага інстытута культуры пад кіраўніцтвам вядомага бібліяграфазнаўца, прафесара А.Д. Эйхенгольца. У хуткім часе выйшла ў свет манаграфія «Беларуская рэтраспектыўная бібліяграфія кніг». У 1988 г. у Маскве В.Е. Лявончыкаў абараніў доктарскую дысертацыю на тэму «Сістэма бібліяграфічнай інфармацыі саюзнай рэспублікі: тэарэтыка-метадалагічныя праблемы». Вынікі гэтага даследавання знайшлі адлюстраванне ў манаграфіі «Сістэма бібліяграфічнай інфармацыі саюзнай рэспублікі».

Кола навуковых інтарэсаў В.Е. Лявончыкава вельмі шырокае. Гэта тэарэтыка-метадалагічныя пытанні бібліяграфазнаўства і бібліятэказнаўства, гісторыя беларускай бібліяграфіі, пытанні бібліятэчнай адукацыі, інфармацыйнай культуры, бібліятэчнай камунікатывістыкі, інфармацыйная свабода і інфармацыйная бяспека, бібліятэкі ў сістэме бесперапыннай адукацыі, інфармацыйныя адукацыйныя рэсурсы і інш. Адметныя рысы ўсіх прац В.Е. Ля-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вончыкава – грунтоўнасць метадалагічнай і фактаграфічнай асновы, дакладнасць даследчых мэт і сістэмы навуковай аргументацыі, тэарэтычная і практычная навізна і значнасць.

Васіль Емяльянавіч надаваў вялікую ўвагу падрыхтоўцы навукова-педагагічных кадраў. Ён быў адным з арганізатараў стварэння аспірантуры ў БДУКМ, абіраўся старшынёй і намеснікам старшыні спецыялізаваных саветаў па абароне кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый. Пад яго кіраўніцтвам былі абаронены шэсць кандыдацкіх дысертацый: В.І. Саітава, прафесар БДУКМ; Т.В. Кузьмініч, намеснік дырэктара НББ; І.В. Дрыга, начальнік галоўнага ўпраўлення культуры і аналітычнай работы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь; А.В. Прадзеіна, дацэнт кафедры культуралогіі і псіхолага-педагагічных дысцыплін Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў БДУКМ; Ібрагім Бадархан, дацэнт Курдскага ўніверсітэта (Ірак); Ж.Л. Раманава, загадчык кафедры інфармацыйных рэсурсаў і камунікацый БДУКМ [4].

Сёння інтэлектуальную аснову навуковай школы складае прафесарска-выкладчыцкі склад кафедр бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці, інфармацыйных рэсурсаў і камунікацый факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый (ФІДК) БДУКМ, супрацоўнікі НББ, якія абаранялі дысертацыі ў спецыялізаваным навуковым савеце БДУКМ, а таксама прадстаўнікі іншых бібліятэк і ўстаноў. За час існавання навуковай школы былі абаронены адна доктарская (Р.С. Матульскі) і звыш 20 кандыдацкіх дысертацый. Сярод уладальнікаў вучонай ступені кандыдата педагагічных навук пяць грамадзян замежных краін: Іарданіі, Ірака, Камеруна, Сірыі.

Праблематыка даследаванняў і распрацовак у навуковай школе сёння ўключае пытанні гісторыі, тэорыі, метадалогіі, методыкі, тэхналогіі, арганізацыі бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці, бібліяграфіі, кніжнай і інфармацыйнай культуры, падрыхтоўкі бібліятэчных кадраў. Паколькі навуковая школа ўтворана ў галіне педагогікі, вялікая ўвага ў даследаваннях надаецца распрацоўцы педагагічных аспектаў, якія звязаны з выкарыстаннем кнігі, інфармацыі, інфармацыйных рэсурсаў у развіцці асобы, выхаванні і адукацыі ва ўмовах бібліятэчна-інфармацыйных устаноў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Колькасна і якасна навукова-педагагічная школа ў 2019 г. складаецца з чатырох дактароў (В.У. Буткевіч, В.Е. Лявончыкаў, Р.С. Матульскі, В.В. Нешытой) і звыш 30 кандыдатаў навук (У.А. Акуліч, В.М. Бігеза, В.І. Брычкоўскі, Н.Ю. Бярозкіна, Н.Ю. Вайцэховіч, Ю.М. Галкоўская, Л.А. Дзямешка, А.Е. Далгаполава, Л.І. Доўнар, І.У. Дрыга, С.В. Зыгмантовіч, С.У. Ільіна, А.Ю. Казленка, В.А. Касап, Н.У. Клімянкова, Т.В. Кузьмініч, Н.А. Ляйко, А.Э. Паліцэвіч, С.А. Паўлава, Ю.А. Пераверзева, Б.В. Пятрэнка, Н.Я. Пятушка, А.В. Прадзеіна, Л.І. Ракавецкая, Ж.Л. Раманава, Р.А. Ровіна, В.І. Саітава, І.Б. Стралкова, Э.С. Суддзя, А.А. Суша, А.М. Фёдарава, М.А. Яцэвіч). У склад навуковай школы ўваходзяць таксама аспіранты і выпускнікі аспірантуры, якія маюць навуковыя публікацыі, супрацоўнікі навуковых аддзелаў буйных бібліятэк краіны.

Толькі за апошнія 10 гадоў было апублікавана каля 700 навуковых і навукова-метадычных прац, сярод якіх навуковыя артыкулы, 12 манаграфій, 5 зборнікаў навуковых артыкулаў, 4 зборнікі матэрыялаў канферэнцый, прысвечаных юбілеям ФІДК, звыш 30 вучэбных і 8 навукова-практычных дапаможнікаў, 4 адукацыйныя стандарты, вялікая колькасць тыпавых вучэбных праграм. Навуковыя працы вучоных друкаваліся ў ЗША, Казахстане, Латвіі, Літве, Польшчы, Расіі, Украіне і іншых краінах.

Матэрыялы навуковых даследаванняў прадстаўнікоў навукова-педагагічнай школы актыўна ўкараняюцца ў адукацыйны працэс ФІДК і інфармацыйна-бібліятэчную практыку. На базе навуковых бібліятэк Беларусі ствараюцца філіялы кафедр, што дае магчымасць каардынаваць і праводзіць навуковыя і навуковаметадычныя даследаванні, канферэнцыі, семінары, круглыя сталы; займацца апаніраваннем дысертацыйных даследаванняў; рэцэнзаваць навуковыя і навукова-метадычныя выданні; выконваць дысертацыйныя даследаванні, дыпломныя работы, якія максімальна набліжаны да бібліятэчнай практыкі. У апошнія гады прадстаўнікі навуковай школы ўдзельнічаюць у выкананні навуковых даследаванняў па заданні Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.

Навукова-педагагічная школа мае стасункі з айчыннымі і замежнымі навуковымі ўстановамі, універсітэтамі, бібліятэкамі і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

грамадскімі аб'яднаннямі. Сярод айчынных: Нацыянальная бібліятэка Беларусі, Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (у бібліятэцы функцыянуе філіял кафедры інфармацыйных рэсурсаў і камунікацый БДУКМ), усе галіновыя рэспубліканскія бібліятэкі Беларусі, Беларускі інстытут сістэмнага аналізу і інфармацыйнага забеспячэння навукова-тэхнічнай сферы (БелІСА), грамадскае аб'яднанне «Беларуская акадэмія адукацыі». Сярод замежных: Маскоўскі, Санкт-Пецярбургскі, Казанскі, Краснадарскі дзяржаўныя інстытуты культуры, Чалябінская дзяржаўная акадэмія культуры і мастацтваў, Арлоўскі дзяржаўны інстытут мастацтваў і культуры, Смаленскі дзяржаўны інстытут мастацтваў (Расія), Кіеўскі нацыянальны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, Харкаўскі нацыянальны ўніверсітэт мастацтваў, Ровенскі дзяржаўны гуманітарны ўніверсітэт (Украіна), Вільнюскі ўніверсітэт (Літва), Вроцлаўскі ўніверсітэт (Польшча), Сафійскі ўніверсітэт бібліятэказнаўства і інфармацыйных тэхналогій (Балгарыя), Універсітэт Інха (Рэспубліка Карэя), Вестфальскі ўніверсітэт імя Вільгельма (Германія) і інш.

Навуковая школа вядома далёка за межамі Беларусі, мае грамадскае прызнанне. Яе члены маюць ганаровыя званні, узнагароджаны медалямі, нагруднымі знакамі міністэрстваў, міжнароднымі дыпломамі. Навукоўцы з'яўляюцца правадзейнымі членамі (акадэмікамі, членамі-карэспандэнтамі) ГА «Міжнародная акадэмія інфарматызацыі пры ААН» (Масква), ГА «Беларуская акадэмія адукацыі», Міжнароднай Кірыла-Мяфодзіеўскай акадэміі славянскай асветы, членамі рэдкалегій і рэдакцыйных саветаў айчынных і замежных навуковых часопісаў і зборнікаў, аргкамітэтаў міжнародных і рэспубліканскіх навуковых канферэнцый, навуковых экспертных, вучоных, навукова-метадычных саветаў, вучэбна-метадычных аб'яднанняў, савета па абароне дысертацый на саісканне вучонай ступені кандыдата педагагічных навук па спецыяльнасці 05.25.03 «Бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства» (першым старшынёй гэтага савета быў прафесар В.Е. Лявончыкаў, пазней – прафесар Я.Д. Грыгаровіч, а зараз – прафесар Р.С. Матульскі).

Такім чынам, нацыянальная педагагічная школа ў галіне бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства – гэта важ-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ны сацыяльны інстытут, які аказвае ўплыў на развіццё навуковых даследаванняў у сферы культуры і спрыяе падрыхтоўцы высокакваліфікаваных навукова-педагагічных кадраў. Далейшае развіццё навуковай школы, на наш погляд, павінна быць звязана з пашырэннем яе колькаснага і якаснага складу за кошт больш актыўнай абароны кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый, падрыхтоўкі манаграфічных даследаванняў, больш шчыльнага ўзаемадзеяння з навуковымі падраздзяленнямі буйнейшых бібліятэк Беларусі.

ЛІТАРАТУРА

1. **Астахова, Л. В.** Библиография как научный феномен : монография / Л. В. Астахова. – Москва : МГУ культуры, 1997. – 338 с.

2. **Григорович, Я.** Диссертационные исследования в области библиотечного дела (2000–2003 гг.) / Я. Григорович, В. Леончиков // Бібліятэчны свет. – 2004. – № 2. – С. 22–24.

3. **Захарчук, Т. В.** Научные школы в библиографоведении: проблемы формирования и идентификации / Т. В. Захарчук ; науч. ред. Т. В. Михеева. – Санкт-Петербург, 2012. – 240 с.

4. **Касап, В. А.** Ученый, педагог, организатор / В. А. Касап, В. И. Саитова // Библиография. – 2012. – № 3. – С. 125–127.

5. **Кожевникова, Л. А.** Библиотековедческие научные школы: методы анализа и диагностики / Л. А. Кожевникова // Библиотековедение. – 2014. – № 1. – С. 22–25.

6. **Липень, С. В.** Обзор диссертаций, защищенных в Республике Беларусь по специальности 05.25.03 «Библиотековедение, библиографоведение и книговедение» / С. В. Липень // Бібліятэчны веснік : [зб. арт.] / Нацыянальная бібліятэка Беларусі ; [рэдкал.: Р. С. Матульскі (старшыня) і інш.]. – Мінск, 2016. – Вып. 8. – С. 205–214.

7. **Лявончыкаў, В.** Навукова-даследчая работа выкладчыкаў ФБІС Беларускага універсітэта культуры / В. Лявончыкаў // Бібліятэчны свет. – 2000. – № 4. – С. 25–27.

8. **Яцэвіч, М. А.** Навукова-педагагічная школа ў галіне бібліятэказнаўства, біліяграфазнаўства і кнігазнаўства (да 20-годдзя стварэння) / М. А. Яцэвіч // Веснік БДУ культуры і мастацтваў. – 2015. – № 2. – С. 157–164.

*Разглядаецца навуковая школа ў бібліятэказнаўстве, бібліяграфазнаўстве і кнігазнаўстве Беларусі – яе гісторыя, дынаміка развіцця, сучасны стан. Раскрыта праблематыка даследаванняў і распрацовак у нацыянальнай навукова-педагагічнай школе.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*The article is devoted to the scientific school of librarianship, bibliography and book science of Belarus – its history, the dynamics of development, the current state. Solved the problems of research and development in the national scientific and pedagogical school.*

Артыкул паступіў у рэдакцыю 26.02.2019

***Козленко Елена Юрьевна***
Белорусский государственный университет культуры и искусств

## БИОБИБЛИОГРАФИЧЕСКИЙ ДИСКУРС ФАКУЛЬТЕТА ИНФОРМАЦИОННО-ДОКУМЕНТНЫХ КОММУНИКАЦИЙ БЕЛОРУССКОГО ГОСУДАРСТВЕННОГО УНИВЕРСИТЕТА КУЛЬТУРЫ И ИСКУССТВ

В настоящий момент в Республике Беларусь уровень высшего библиотечно-информационного образования, отсчитывающего свою историю с 1944 г., представлен факультетом информационно-документных коммуникаций Белорусского государственного университета культуры и искусств (БГУКИ). Исследование биобиблиографического дискурса факультета позволяет рассматривать историю и достижения факультета в персональном аспекте посредством изучения биобиблиографий его видных деятелей, которые являются его специфической коммуникативной формой.

Само понятие «дискурс» – одно из сложных и трудно поддающихся определению терминов современной лингвистики, семиотики и философии. В его значении подразумевается речь, текст, слово, выступление, рассуждение. В отличие от речи, дискурс предполагает систему, он обладает свойством целостности. Дискурс – это речь, наделенная социокультурным измерением, или язык, преобразованный говорящим субъектом и включенный в конкретный социокультурный контекст [8; 12].

Понятия «дискурс» и «дискурсивный анализ» нашли широкое применение в социальных и гуманитарных науках. Историки

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ